но с политпросветами, агитпропами партийных комитетов и отделами народного образования Советов пытались поднять культурный уровень масс и отвечать на самые злободневные запросы. В сознании людей утвердилось представление о том, что интересы "рабоче-крестьянского государства" являются их кровными интересами, и вся культурная работа ЦСПСБ была подчинена выполнению социального заказа государства.

Однако, 1929 год можно считать рубежом в этой работе. Пропаганда классовой нетерпимости, гонения на инакомыслящих и чистка трудовых коллективов от "социально-чуждых" элементов свели на-нет все то, что было накоплено за предшествующий период. В дальнейшем профсоюзы и их рабочие клубы, всевозможные организации, ассоциации, кружки и общества были превращены в пресловутый "приводной ремень от партии к массам" и послужили орудием в руках утвердившейся командной Системы.

М.М.Грынчык
(кафедра лІтаратуры)

## ДУХОУНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ СЛОВА...

Як вядома, выхавауча-патрыятычны пафас беларускай паэзII 20-х гг. самым непасрэдным чынам бну звязаны з той атмасферай грамадскага уздыму, што абумоулены агульным напрамкам сацыяльна-культурных пераутварэнняу у першае паслярэвалюцыйнае дзесяцIгоддзе. Мастацкая лIтаратура I яе найбольш развIты, авангардны жанр лIрычная паэзIя, засвойваючы або працягваючы яшчэ жывыя традыцыI папярэдняга дакастрычнIцкага этапу, выяуляу разам з тым новыя магчымасцI I перспектывы, новы духоуны патэнцыял працоунага чалавека: раскаванасць яго творчых сIл, душэуную актыунасць I энтузIязм, сIлу вольнай працы, новыя суаднос1ны мIж народамI, людзьмI I класамI.

Гэта была сапраудны наватарская лIтаратура як па сваIх эстэтычных функцыях, так I па характары грамадскIх Iдэалау, па сутнасцI сваIх зыходных творчых прынцыпау. Традыцыйныя рысы нацыянальнага аблIчча беларуса (працавIтасць, стойкасць, пачуццё асабIстай годнасцI, адкрытасць, чэснасць, павага да Iнших народау) дапауняюцца цяпер новымI надзвычай IстотнымI якасцямI – рэвалюцыйнай ма-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танакIраванасцю, гIстарычнай прадбачлIвасцю I чуйнасцю, душэунай актыунасцю I шматграннасцю. АнталагIчнымI сталI вядомыя вершы Я.Купалы ("Свайму народу", "Спадчына", "Арлянятам", "ЛетапIснае"), Я.Коласа ("Да працы", "ПоклIч", "Водгулле", "Грамадауцам"), Ул.ДубоукI ("О Беларусь, мая шыпшына", "На родных прасторах"), вершы М.Чарота, Я.Пушчы I Інш., прысвечаныя раскрыццю новых тыпалагIчных рыс народнага характару у кантэксце тагачасных сацыяльна-псIхалагIчных змен I працэсау.

Па сутнасцI ужо у 20-я гг. у беларускай паэзII, у яе лепшых узорах I здабытках склалася тая плённая творчая канцэпцыя чалавека, як сапрауднага гаспадара жыцця I творцы гIсторыI, якая была вылучана раней у найбольш значных творах прогрэсIунай сусветнай лIтаратуры (ДэстаеускI, Талстой, ГоркI, ХэмIнгуэй, Олдынгтон I Інш.).

Канцэпцыя духоунасцI, духоунай актыунасцI чалавека у беларускай паэзII 20-х гг. фармIруецца на глыбокай гуманIстычнай аснове, цесна звязанай з фальклорнай традыцыяй. Вышэйшым яе крытэрыем з'яулялася грамадска-патрыятычная актыунасць, культ стваральнай працы, павага да усIх народау свету, да працоунага чалавека асаблIва. ТакI падыход да Ідэйна-эстэтычных I этычных праблем абумовIу велIзарны уплыу тагачаснай беларускай паэзII на фармаванне духоунай культуры народа, ён поунасцю адпавядау новым творчым прынцыпам усёй савецкай лIтаратуры, прынцыпам сапраўднай народнасцI I рэалIзму.

Аднак агульны маральна-выхавауча патэнцыял беларускай паэзII, здабыты у 20-я гг. пад уплывам несрыяльных, у першую чаргу, рэпрэсIуных умоу у 30-я гг. прыкметна звужаецца I блякне. Адкрытая публIцыстычнасць, знешнI рытарызм I дэкларацыйнасць прыкметна паслаблялI агульны сацыяльна-фIласофскI змест беларускай лIрыкI, прыдаючы ёй характар рэпартажнай павярхоунасцI, юбIлейнай фрагментарнасцI, мастацкай незавершанасцI I аморфнасцI. Эстэтычная дзейнасць такIх творау, пазбауленных вострых калIзIй I эмоцый, рытарычных па форме паэтычнага самавыяулення, зразумела, не магла быць высокай цI трывалай.

Значная, калI не рашаючая роля у гэтым імклівым спадзе эстэтычнага узроуню беларускай лIрыкI пачатку 30-х гг. адыграла тагачасная вульгарна-сацыялагIчная крытыка на чале з акад.Бальцэвічам, Л.Бэндэ, А.Кучарам I Іншымі не менш [illegible] [illegible] [illegible]. [illegible]-

лабельнага цэху".

Нават на такIх загартаваных у творчай барацьбе паэтау, як Я.Купала I Я.Колас, гэтая крытыка аказала супярэчлIвы, а часам I адмоуны уплыу. Нагадаем тыя вульгарныя, па сутнасцI фальсIфIкатарскIя ацэнкI, якIя давалIся класIчнай паэме Я.Коласа "Новая зямля" як твору антысацыялIстычнай, уласнIцкай псIхалогII сялянства I яе адмоунага уплыву на выхаванне працоуных мас. У той жа час вIдавочна уся гIстарычная прадбачлIвасць паэта I яго творчай канцэпцыI, скIраванай на духоунае вызваленне чалавека, выхаванне у Iм лепшых патрыятычных рыс, духоунай актыунасцI, любовI да зямлI I працы, сапрауднага грамадзянскага светасузIрання, пачуцця гуманIзму I альтруIзму.

Зразумела, што бесперапынныя нападкI вульгарызатарау ад крытыкI, масавыя рэпрэсII I тэрор, якIя пачалIся у БеларусI у пачатку 30-х гг., не маглI пахIснуць тыя зыходныя эстэтычныя прынцыпы, што былI выпрацаваны у пачатку 20-х гг., хоць I уплывалI на агульную творчую атмасферу, творчую актыунасць многIх пIсьменнIкау. Я.Купале паступова удалося вырвацца з творчай дэпрэсII, звярнуушыся да багатых традыцый братнIх лIтаратур, шырокага выкарыстання свайго асабIстага вопыту нацыянальнага фальклору (паэмы "Над ракой Арэсай", "Тарасова доля", многIя вершы ляукоускага цыкла I Iнш.). Для Я.Коласа, гэты перыяд творчага спаду зацягнууся аж да канца 30-х гг., калI ёе звярнууся Iзноу да распрацоукI шырокIх эпIчных жанрау I задум (апавяданнI, задума "Рыбаковай хаты" - восень 1939 г.).

Духоуная культура чалавека, яго унутраны свет, маральна-псIхалагIчнае аблIчча у лIрыцы 30-х гг. усё больш паслядоуна I мэтанакIравана падпарадкоувающца I звязвающца з сацыяльна-палIтычнымI працэсамI часу. Пісаць "па свежых слядах падзей" у гэты час становIцца цI не адзIным творчым прынцыпам усёй беларускай лIтаратуры. Гэты паварот да актуальнай сацыяльна-палIтычнай праблематыкI за кошт сацыяльна-гIстарычнай, бытавой I маральна-фIласофскай - характэрная дамiнантная рыса лIрыкI 30-х гг. Яго непасрэдныя вынIкI I прыкметы якбольш поуна выявIлIся у трактоуцы тэмы сацыялIстычнай перабудовы жыцця I чалавека. Духоуная актыунасць, грамадзянскае аблIчча героя раскрыты выключна праз яго адносIны да калектывIзацыI. ТакI звужаны прынцып у абрысоуцы вобраза тагачаснага сялянIна, зразумела, не мог стаць аптымальным у эстэтычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносІнах, аднак доугІ час ёе заставауся пануючым.

Сцвярджальны пафас засяроджаны цяпер пераважна вакол светлых праяу І перспектыу (сацыяльныя даброты, рост культуры, зблІжэнне з горадам І Інш.). На другІ план былу адсунуты адзІн з асноуных фактарау эканамІчнага І культурнага развІцця вёскІ - глыбІнная ІнтэнсІфІкацыя земляробчай працы, яе прадукцыйнасць, стварэнне матэрыяльнага дабрабыту кожнай сям'І. Як вядома, тэхнІчнае забяспячэнне, ІндустрыялІзацыя земляробчай працы - толькІ трамплІн для сапраўднага уздыму вёскІ І краІны у цэлым. І тут роля лІтаратуры, мастацтва, усІх сферау Ідэалагічнага выхавання маглІ адыграць значна большую ролю у фармаваннІ працоуных традыцый, чым яны адыгралІ на справе.

У трактоуцы гэтых складаных праблем адчувалася павярхоунасць, ...легчана-ІдэалІзаваны, а па сутнасцІ фальсІфІкатарскІ падыход. Грамадзянская вартасць чалавека, актыунасць яго пазІцый найчасцей выяуляюцца праз знешнІя дзеяннІ І учынкІ, праз адносІны да перабудовы вёскІ, праз стыхІйную веру у "блІскучую" будучыню. Гэтыя новыя тыпалагІчныя рысы станоучага Ідэалу найбольш выразна выступаюць у прыёмах знешняга, часта схематычнага раскрыцця вобразау, у ІмкненнІ прыдаць Ім "усяленскую" пазанацыянальную маштабнасць, у свядомым, часта перабольшаным падкрэслІваннІ адзІнства І згуртаванасцІ у барацьбе супроць ворага-кулака цІ шкоднІка, адкрытым выклІку замежным ІнтэрвенцкІм сІлам.

Можа, найбольш характэрны у гэтых адносІнах адзІн с раннІх вершаваных цыклау Я.Коласа "Калгаснае" ("Старой вёсцы", "Бабулька", "Кулак", "Сялянка", Серадняк", "Моладзь", 1930). "Калгаснае" - своеасаблІвая драматычная кампазІцыя, пабудаваная у форме шэрагу маналагІчных рэпрызау. У Іх раскрыты драматызм перабудовы вёскІ, няяснасць шляхоу, вострая трывога за будучыню, уся незвычайнасць І жорсткасць сацыяльных змен І працэсау. Пафас верша, яго эмацыянальна-псІхалагІчная атмасфера асветлены Ідэяй пераадолення старых традыцый, архаІчнага укладу вясковага жыцця, ІнтуІтыуным парывам да новых нязведаных вяршынь. Аутарская пазІцыя выяулена тут у непасрэдных рытарычных зваротах І заклІках уступнага верша-пaслання "Старой вёсцы":

ЗІрнІ наперад зоркІм вокам
У наша сённяшняе ранне,
ВІтай дня новага свІтанне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ІдзІ машынам на спатканне
Ды грамадою, цвёрдым крокам! (П,4І)

Аднак у далейшым гэты прыузнята-аптымІстычны тон прыкметна знІжаецца, набываючы у маналогах шматлІкІх персанажау усё больш драматычныя адценнІ. Так, у роздумах І адчуваннях старой вясковай бабулькІ-знахаркІ наступленне новых змен у сацыяльна-бытавым І культурным укладзе вёскІ асацыІруецца з поунай катастрофай, крушэннем асабІстых жыццёвых мар І разлІкау:

Прапау заработак, прапау ён навекІ,
Бо верыць не будуць нІ у шэпты, нІ у лекІ (П,4І)

Такое светаадчуванне, зразумела адлюстройвала некаторыя рэальныя працэсы народнай самасвядомасцІ, рост акульнай сацыяльна-бытавой І духоунай культуры вёскІ, выяуляючы адзнакІ новага часу.

Яшчэ больш супярэчлІвым І каларытным паустае у цыкле "Калгаснае" традыцыйны вобраз вясковага кулака, якІ у сваІх адкрытых "жальбах" выступае прыхІльнІкам перабудовы, нявІннай "ахвярай" беспадстаўных шальмаванняу, неабгрунтаваных абвІнавачванняу. Тут Я.Колас не пайшоу па усталяванай схеме - кулак - вораг калгаса, калектыву:

Дабро маё няшчасце,
Старанасць мая - грэх!
Вакол мяне напасцІ,
Галёканне І брах (П,42)

Яго далейшыя трагІчныя разважаннІ ("АгІтацыя") па сутнасцІ выяуляюць псІхалогІю той часткІ сялянства, якое не хацела трацІць сваёй гаспадарчай незалежнасцІ, як перадумовы асабІстай свабоды І ІнІцыятывы:

Будзешь сядзець на пайку ты,
Жыць па загаду увесь час,
А уласнай не будзе мІнуты, -
Вось што такое калгас! (П,42-43)

З гэтым маналогам "Кулака" непасрэдна пераклІкаюцца роздумы серадняка, як "буржуазнай праслойкІ":

Людская сІла дробІцца,
І што тут нІ талкуй,
А з нас, выходзІць, робІцца
Буржуй-ІндывІдуй! (П,44)

АдзІнай рэальнай сІлай новых сацыялІстычных пераутварэнняу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выступае толькI вясковая бядната I арганIзаваная частка вясковай моладзI, якая рашуча, без аглядкI Iдзе насустрач новаму:

Трактар будзэ наша зброя,
СIла - моладасць, парыу,
На работу сыпнем роем,
Свет нанова перакроIм
Дык жывI ты, калектыу! (П,46)

ВIдавочна, шта сама праблема духойнага абнаулення чалавека, выхаванне яго новых калектывIсцкIх рыс тут амаль не ставIцца - вырашаецца яна у агульным трафарэтна-плакатным плане, як працэс Iмгненны, наканаваны кIмсьцI зверху. Сапраудная, рэалIстычна абгрунтаваная матывIроукI паводзIн I учынкау тут няма - складаны працэс ломкI, перабудовы жыцця у народнай самасвядомасцI тут толькI выпу... Гэта не значыць, што паэт не разумеу усёй складанасцI перабудовы вёскi - дастаткова нагадаць вобраз Пракопа ДубягI з аповесцI "Адшчапенец"(1932) I яго апантаныя пошукI адказу на усе надзённыя праблемы вясковага жыцця. Аднак гэта быу жанр аповесцI. У лIрычнай паэзII раскрыць усе складанасцI калектывIзацыI было амаль немагчымым - I не толькI па прычыне асаблIвай пIльнасцI вульгарна-сацыялагIчнай крытыкI I драконаускай цэнзуры, але I па прычынах самога жанра, жанра патэтычнага, якому уласцIва выключная глыбIня I шчырасць перажывання. ВIдаць, пагэтаму мы не можам назваць творы, якIя б адэкватна здолелI перадаць цI засведчыць усю складанасць I непауторнасць таго драматычнага часу.

Уся беларуская, ды не толькI беларуская, паэзIя 30-х гг. пайшла па шляху знешняга Iлюстрацыйнага адлюстравання падзей, абыходзячы часта або спрашчаючы вострыя псIхалагIчныя I грамадскIя канфлIкты свайго часу.

Найбольш прыкметнага поспеху, а г.зн. I уплыву на чытацкIя масы, асаблIва юнацтва I яго духоунае фармаванне дасягнула у гэтыя гады грамадзянска-патрыятычная, публIцыстычная паэзIя Коласа, Купалы, БроукI, ГлебкI, Куляшова I Iнш. Зразумела, далейшая Iнтэнсiуная распрацоука гэтага жанру для нашай лIтаратуры была з'явай заканамернай I плённай - за плячамI амаль стогадовы вопыт Чачота, МарцIнкевIча, КалIноускага, БагушэвIча, Лучыны, ЦёткI, Гаруна I БагдановIча. I трэба адзначыць, што менавIта гэты публIцыстычны жанр нашай паэзII 30-х гг. аказауся найбольш уплывовым, ён становучы уздзейнIчау на выхаванне грамадзянскIх рыс савецкага

чалавека, яго маральнае аблIчча I Iнтэлектуальны узровень. Нагадаем тут "Дыктатуру працы", "Песню будаўнIцтву", "Май", ляукоускI цыкл Я.Купалы, цI "КраIне Саветау", "Заходняй БеларусI", "Раскуты Прамятэй", "Песняй вIтаю я вас" Я.Коласа, лепшыя вершы БроукI, Куляшова, ГлебкI I Iнш. Бяспрэчна, паэзIя такога мастацкага узроуню, патрыятычнага накалу станоуча уплывала на свядомасць сучаснIка, яна з'яулялася даволI дзейсным фактарам маральнага фармавання чалавека, арганIчна уваходзячы у ягоную духоуную культуру I грамадзянскI кодэкс.

Аднак узмацненне культу асобы I звязаныя с Iм масавыя палIтычныя рэпрэсII сярэдзIны 30-х гадоу прыкметна звужаюць выхавауучае уздзеянне мастацкай лIтаратуры, прыдаючы ёй аднабаковы дагматычны характар. РэалIстычны метад савецкай лIтаратуры, вылучаны на I з'ездзе СП СССР, найчасцей атоесамлIвауся з надзённасцю праблематыкI, а рэвалюцыйная мэтанакIраванасць, гIстарычная прадбачлIвасць I перспектыунасць паступова набываюць характар залIшняй IдэалIзацыI рэчаIснасцI I тых поспехау, што былI дасягнуты на пачатковым этапе савецкага будаунIцтва у галIне культуры I эканомIкI.

Найбольш яскрава гэтыя супярэчлIвыя тэндэнцыI выявIлIся у лIрыцы Я.Купалы I А.Куляшова другой паловы 30-х гг. Паварот да народна-песенных традыцый, пераважнае выкарыстанне прыёмау абагульняюча-сIмвалIчнай тыпIзацыI прыдавалI многIм творам гэтага цыклу знешне-стылIзатарскI, дэкларацыйны характар, перабольшаную увагу да светлых, IдэалIзаваных праяу народнага жыцця, хоць у цэлым уплыу беларускай паэзII на духоуную культуру у гэты час прыкметна узмацняецца. Аднак больш плённа гэтыя лIтаратурна-фальклорныя узаемасувязI выявIлIся толькI у вогненныя гады вайны, калI беларуская паэзIя у значнай ступенI вярнула страчаныя раней Iдэйна-эстэтычныя здабыткI I пазIцыI.

Найбольш маштабна духоуная знIтаванасць лIтаратуры з лёсам народа выявIлася у творчасцI нашых класIкау, народных песняроу Я.Купалы I Я.Коласа. КалI вызначаць асноуны, магIстральны напрамак развIцця беларускай паэзII гэтага перыяду, то яго можна акрэслIць як паглыбленне героIка-патрыятычных, народных асноу. У гэты час рэзка звужаецца сфера вульгарна-сацыялагIчных уплывау, адчуваецца вольнае дыханне чалавечых пачуццяу I эмоцый, узмацненне гуманIстычных Iдэй I матывау. I гэта зусIм натуральна, бо на-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

род, як і яго літаратура, вяртаўся да тых адвечных асноў і прынцыпаў, што вякамі жывілі народную душу і якія дапамагалі пераадолець самыя жорсткія гістарычныя выпрабаванні.

Для беларускай літаратуры гэты працэс "вяртання наперад" быў асабліва арганічным, можна сказаць, заканамерным. Яшчэ з часоў Скарыны, а затым праз увесь перыяд барацьбы з польска-каталіцкай экспансіяй у XVII і XVIII ст. беларускае слова заставалася адзінай зброяй за захаванне нацыянальнай самабытнасці і свабоды. У XIX-XX ст. яно стала звястуном новых рэвалюцыйна-вызваленчых ідэй, яно стала сімвалам нязломнасці народнага духу, носьбітам перадавых грамадскіх ідэалаў.

Важна падкрэсліць, што самая ідэя нацыянальнага вызвалення, пачынаючы з К.Каліноўскага і Ф.Багушэвіча, ніколі не ўспрымалася іманентна, ізалявана ад лёсу іншых, у першую чаргу, братніх славянскіх народаў. Праблема свабоды выражалася ў кантэксце змагання усіх прыгнечаных народаў за сваю сапраўдную незалежнасць, яна арганічна звязвалася з сацыяльным вызваленнем:

Эх, кінце крыўдамі карміцца -
Кожны народ сам сабе пан;
І беларус можа змясціцца
У сям'і нялічанай славян![1]

Гэтыя каштоўныя гуманістычныя традыцыі беларускай паэзіі своеасабліва праявіліся ў вогненныя гады Вялікай Айчыннай вайны. І як гэта ні парадаксальна гуманізм, глыбока чалавечны патрыятычны пафас нашай літаратуры выяўляўся праз сваю дыялектычную супрацьлегласць - любоў праз нянавісць, вялікадушша праз жорсткасць. Пра гэта трапна ў свой час сказаў І.Эрэнбург у артыкуле "На пароге": "З салдацкай флягі мы хлябнулі сцюдзёнай вады. Яна абсалютна рот не горш за спірт... Мы ненавідзім немцаў не толькі за тое, што яны нізка і ганебна забіваюць нашых дзяцей. Мы іх ненавідзім і за тое, што павінны іх забіваць, што з усіх слоў, якімі багаты чалавек, нам цяпер засталося адно: забі"[2].

Гэтая унутраная супярэчлівасць і трагізм патрыятычнай тэмы, уласцівая усёй савецкай літаратуры ваеннага часу, выяўлялася ў творчасці кожнага асобнага паэта своеасабліва, строга індывідуальна - у адпаведнасці з яго творчым вопытам, эмацыянальна-псіхала-

1. Купала Янка. Шляхам жыцця. - В., 1913. - С.147.
2. Ортенберг Д. Год 1942. - М., 1988. - С.460.

гічным станам, нарэшце, асабістым тэмпераментам.

Спецыфіка творчага самавыяулення у жанрах грамадзянска-патрыятычнай лірыкі, на наш погляд, амаль не даследавана. У той жа час відавочна яе надзённасць і актуальнасць у наш час – без гэтага немагчыма раскрыць фенамен раптоунага павароту нашай традыцыйна гуманнай і міралюбівай паэзіі да праблем выключна жорсткіх і трагічных, не уласцівых нашай нацыянальнай літаратуры, цесна звязаней з выключнай дабрынёю і гуманнасцю характару беларуса, сфармаванага стагодзямі змагання і пакут.

А.Ф.Майсеенка
(кафедра літаратуры)

## ДУХОУНЫ ВОБЛІК ГЕРОЯ

Лепшыя творы беларускіх празаікау 70-х гадоу аб Вялікай Айчыннай вайне набылі сусветны рэзананс, знайшлі і знаходзяць дарогу да чытача у самых розных кутках планеты. У тыя гады узрастала увага літаратуры да вытокау паводзін чалавека на вайне, да выяулення глыбінных рыс характару героя, яго духоунага аблічча.

Сучасная літаратурная крытыка справядліва адзначае, што паглыбленне гістарызму у такіх выпадках суправаджалася узмацненнем псіхалагізму і аналітызму уадлюстраванні унутраных перажыванняу героя. Гэты працэс ахопліваУ творчасць шмат якіх савецкіх пісьменнікау, але асабліва выразна і пленна ён выявіуся у прозе В.Быкава.

Не былі выключэннем у гэтым сэнсе аповесці "Сотнікау" і "Абеліск", у якіх В.Быкау звярнууся да падзей партызанскай вайны у тыле ворага, асвятліу іх духоуным, эмацыянальным вопытам свайго часу. Гэтыя творы з'явіліся у друку у пачатку 70-х гадоу і сталі падзеяй у літаратурна-грамадскім жыцці, выклікалі гарачыя спрэчкі. Пры гэтым крытычныя водгукі на гэтыя творы былі далека не адназначнымі. Побач са справядліва высокай ацэнкай іх значнасці (А.Адамовіч, В.Каваленка, Дз.Бугаеу, В.Буран, С.Андраюк і інш.) гучала неаб'ектыунасць, прадузятасць, якую сення можна вытлумачыць хіба што тагачаснай грамадска-палітычнай кан'юнктурай. Вось што пісау, напрыклад, Б.Ляонтаў: "К сожалению, у В.Быкова нет исторического, победного пафоса в [illegible]чх.

О каком подвиге [illegible] можно говорить, если этот человек

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ